# ВЯРБІЦКІ
# Іван Іванавіч



## Біяграфія.

Нарадзіўся ў беднай сялянскай сям'і ў вёсцы Куравічы Навагрудскага раёна. Вучыцца пачаў у 1938 годзе ў польскай паўшэхнай школе. Мольніцкую сямігодку закончыў у 1948 годзе і паступіў у Навагрудскае педвучылішча. У час службы ў Савецкай Арміі ў 1954 годзе закончыў 10 класаў вячэрняй афіцэрскай школы. У 1955 годзе атрымаў атэстат аб заканчэнні педвучылішча. Гістарычнае аддзяленне БДУ імя Леніна закончыў завочна (1962г.).

Працаваў настаўнікам пачатковых класаў, завучам і дырэктарам школы, настаўнікам гісторыі, метадыстам па гісторыі.

# Творчасць.

Першы верш быў надрукаваны ў Навагрудскай раённай газеце «Новае жыццё» 5 снежня 1948 года. Пісаў вершаваныя і празаічныя творы рознай тэматыкі: каханне, услаўленне прыгажосці роднага краю, роздум пра сэнс жыцця. Зборнікі вершаў: «Водар чаромхі» (1998), «Край Карэліцкі мой» (2009), «Імкненне» (2014).

Звяртаўся аўтар да гісторыі края. Кнігі: «Ручніком дарожка» (2004), «Шырокае поле здзяйснення» (2005), «У сэрцы з клятвай Гіпакрата» (2006), «Ад мінуўшчыны-дарогай…» (2013).















# КАРЭЛІЦКІ РАНАК

Світанак лёгкі і прыгожы,
Нідзе такога не знайсці,
Хаця б красы не патрывожыць,
Не даць раптоўна адцвісці.

Не патаптаць травы духмянай
На бліжнім выгібе ракі,
Стаю ад шчасця апантаны –
Прасцяг затоены такі.

А лозы над ракою хіляць
Свае галовы ў цішыні,
Вось-вось мінуць такія хвілі,
І час настане мітусні.

Нахлыне
сонечных праменняў,
І наваколле ажыве,
Стракозаў,
схопячы праменні,
Атрад крылаты паплыве.



*Фота аўтара*

Але разутаю нагою
Ступаю ўсё ж на мурагі,
І ў сэрцы ажываюць мроі:
«Паклон, куточак дарагі».

Яшчэ раса блішчыць, як мора,
Туман знікае, нібы дым,
Вітаю сонейка бадзёра
І крочу ўдаль, як малады.

# УСПАМІН

У бацькі не паэзіі вучыўся,
Спагады ад матулі не чакаў,
А пасучы кароў, не раз таміўся
І на мяжы часценька засынаў.

Мяне палі з густою збажыною,
Духмяныя раздольныя лугі
Адорвалі паэзіяй сваёю
Сярод нуды і чорствае смугі.

Усё пазней у сэрца мне запала,
Каб выліцца радкамі на прасцяг,
Хоць перажыў я цяжкасцей нямала,
Ды кіраваў на вызначаны шлях.

І бацькаўшчына ў сэрцы засталася,
Таму я доўга не магу тужыць,
І шчырасцю адорваць узялася,
Каб мне лягчэй было на свеце жыць.